**Валахановіч С.А.,**
*аспірантка кафедры
педагогікі і псіхалогіі*

# МАСТАЦКІ ВОПЫТ БАЦЬКОЎ ЯК УМОВА ТВОРЧАГА РАЗВІЦЦЯ ДЗЯЦЕЙ ДАШКОЛЬНАГА ЎЗРОСТУ

Стварэнне ў сям'і ўмоў, якія дазваляюць дзіцяці развіваць яго творчы патэнцыял,— гэта не толькі сацыяльная, але і псіхолага-педагагічная мэта. Мастацтва з'яўляецца унікальным сродкам развіцця ў дзіцяці эмацыянальнай сферы, вобразнага мыслення, эмацыянальна-каштоўнасных адносін да свету.

У спецыяльна арганізаванай дарослымі мастацкай дзейнасці і пад уплывам навакольнага асяроддзя ў дзіцяці фарміруюцца асновы эстэтычнай свядомасці, элементы мастацкай культуры. Азы вобразнай прыроды мастацтва, якія дзеці атрымліваюць у сям'і, уплываюць на фарміраванне іх творчых здольнасцей.

Пры вывучэнні ўмоў мастацка-творчага развіцця дзяцей дашкольнага ўзросту ў сям'і перад намі паўсталі некаторыя аспекты гэтай праблемы. Адзін з іх — уплыў мастацкага вопыту бацькоў на творчае развіццё дзіцяці. Узнікла патрэба ў вырашэнні наступных задач:

1) вывучэнне ўменняў і навыкаў бацькоў у галіне мастацкай дзейнасці праз анкетаванне, размову, самаацэнку бацькоў;

2) правядзенне творчых эцюдаў па выніках прымянення методыкі якасна-колькаснага аналізу творчых эцюдаў па выніках прымянення методыкі “Эсэ”;

3) супастаўленне і аналіз поспехаў і дасягненняў дзяцей, якія апісвалі бацькі, з баламі, атрыманымі ў выніку прымянення тэста-апытальніка бацькоўскіх адносін Варгі і Століна (шкала тэста “адносіны да няўдач дзіцяці”).

Намі былі адабраны бацькі, якія выказалі жаданне ўдзельнічаць у эксперыменце,— усяго гэта 30 чалавек. Наяўнасць ці адсутнасць мастацкай адукацыі і вопыту бацькоў вывучаліся ў працэсе анкетавання, размоў з бацькамі. У выніку мы вылучылі чатыры катэгорыі бацькоў, якія ўдзельнічалі ў эксперыменце.

Адна з іх — бацькі з малым і абмежаваным мастацкім вопытам, які дазваляе выказаць меркаванне густу (падабаецца — не падабаецца) пра той ці іншы твор мастацтва. У гэтай катэгорыі бацькоў не хапае ведаў пра сутнасць працэсу мастацкага развіцця дзіцяці і яго псіхолага-педагагічных асноў; у іх недастатковы эстэтычны і мастацкі кругагляд, адсутнічае патрэба ў мастацкім самавыхаванні і самаадукацыі.

Да другой катэгорыі мы аднеслі бацькоў, якія маюць сярэднеспецыяльную і вышэйшую адукацыю, але не мастацкую. У працэсе навучання гэтыя бацькі мелі магчымасць праслухаць спецкурсы, якія даюць уяўленне ўвогуле аб развіцці мастацтва. Нехта з іх меў практычны вопыт заняткаў у калектывах мастацкай самадзейнасці. Іх характарызуе наяўнасць неабходнага комплексу ведаў аб сутнасці працэсу мастацкага выхавання і яго псіхолага-педагагічных асноў, яны маюць эстэтычны і мастацкі кругагляд, але не заўсёды валодаюць уменнем рэалізаваць веды ў практычнай дзейнасці.

У трэцюю катэгорыю трапілі бацькі, якія маюць сярэднеспецыяльную адукацыю ў той ці іншай галіне мастацтва і валодаюць уменнямі і навыкамі мастацкага выхавання і развіцця дзяцей у нейкім адным родзе мастацкай дзейнасці (музычнай, танцавальнай, выяўленчай, мастацка-маўленчай, тэатральнай, гульнявой і г.д.).

Нешматлікай аказалася катэгорыя бацькоў, якія маюць вышэйшую адукацыю ў нейкай з галін мастацтва. Гэта бацькі, якія вылучаюцца сфарміраванасцю патрэб у пастаяннай мастацкай самаадукацыі, шырокім мастацкім кругаглядам, высокаразвітымі эстэтычнымі пачуццямі,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

што забяспечваюць мажлівасць эмацыянальнага перажывання; яны валодаюць уменнямі і навыкамі мастацка-творчага развіцця дзіцяці.

Мы меркавалі, што наяўнасць мастацкай адукацыі і практычнага вопыту працы ў пэўнай галіне мастацтва садзейнічае абуджэнню экспрэсіі, сілы пачуццяў, перажыванняў у адной са сфер іх праяўлення. Мы ўлічвалі таксама, што спецыяльныя навыкі і ўменні, сфарміраваныя ў мастацка-творчай дзейнасці, мімаволі могуць быць перанесены ў іншыя віды дзейнасці, павышаючы іх якасць і прадуктыўнасць. Мы ўзялі пад увагу і тое, што актыўны ўдзел бацькоў у сумеснай дзейнасці са сваім дзіцем па вырашэнні творчых задач садзейнічае мастацкаму самаўзвышэнню дарослых праз пераўтварэнне ўласнага мастацкага вопыту.

На першым этапе эксперыментальнай працы мы ўжылі методыку "Эсэ ". Для таго, каб стварыць эмацыянальна прыўзнятую атмасферу, мы ўключылі музыку саксафаніста Славачака. У часе працы над эцюдам неабходна было выкарыстоўваць апорныя словы-паняцці: рух, пастава, вобраз, дзеянне, сілуэт, ракурс, танец, якія дапамаглі б стварыць малюнак танцавальнага мастацтва. Гэта была абавязковая ўмова.

Прааналізаваўшы выкананыя заданні, мы склалі прыкладныя характарыстыкі тыпаў работ бацькоў, якія затым супаставілі з папярэдне выкананымі катэгорыямі ў залежнасці ад наяўнасці мастацкага вопыту. Вынікі першага этапу эксперымента наступныя. Як мы і меркавалі, наяўнасць мастацкай адукацыі, высокі ўзровень эстэтычнага развіцця і мастацкі вопыт дазволілі бацькам добра справіцца з заданнем.

На кожным аркушы, дзе выконвалася заданне, быў пастаўлены нумар, які ведаў толькі ўдзельнік эксперымента. Людзі, якіх выпрабоўвалі, ацэньвалі сваю працу і ўсе іншыя эцюды, выстаўляючы балы ад 0 да 5. Адно эсэ атрымлівала трыццаць адзнак, а ў выніку выводзіўся

сярэдні бал. Якасны аналіз улічваў арыгінальнасць эсэ, навізну і цікавую форму падачы матэрыялу, эстэтычную і мастацкую значнасць, а таксама здольнасць аўтара захапіць і паглыбіць у свет танца. У залежнасці ад якасна-колькаснага аналізу і пастаўленых балаў мы атрымалі “0 тып”, “I тып”, “2 тып”, “3 тып”, “4 тып”, “5 тып” работ удзельнікаў эксперымента.

“0 тып” работ характарызуецца тым, што ў двух эсэ няма назвы. Трое ўдзельнікаў не выканалі заданне. Яны не напісалі ніводнага радка. У напісаных работах аўтары не выкарысталі прапанаваных паняццяў, мастацкі ўзровень работ вельмі нізкі. Аўтары работ зрабілі спробу рэкламы танца. Да гэтага тыпу мы аднеслі 5 работ.

Аўтары эсэ “I тыпу” выкарыстоўваюць прапанаваныя паняцці. Самі эцюды схематычныя, падобныя на эскізныя накіды, у іх не прасочваецца сюжэтная лінія. Форма падачы матэрыялу аднастайная. Адна работа напісана не па тэме. Да гэтага тыпу мы аднеслі тры работы. У шасці работах “2 тыпу” ёсць сюжэт, але ён развіваецца без нарастання дзеянняў. Аўтары дзвюх работ узялі за аснову сюжэта ўрок рытмікі ў школе, на якім дзеці развучваюць танцавальныя рухі. У дзвюх работах людзі, якія выпрабоўваюць, спрабуюць даць азначэнні паняццям, неяк іх афантазіраваць. Бацькі, якія не здолелі самі прыдумаць сюжэтную лінію, узялі за аснову лібрэта балетнага спектакля або дзеі.

У пяці работах, якія мы аднеслі да “3 тыпу” і абазначылі яго як змешаны, кожнае паняцце надзяляецца пэўным вобразам і робіцца дзеючай асобай эсэ. Ёсць работы, якія адрозніваюцца цікавай формай падачы матэрыялу, разнастайнасцю сюжэтных ліній. Аўтары дзвюх работ абралі форму казачнага апавядання, але сюжэтная лінія не скончана, стыль казкі не вытрыманы да канца. Калі чытаеш гэтыя работы, дык застаецца ўражанне, быццам аўтары знаходзяцца ў працэсе пошуку.

Эцюды “4 тыпу” адрозніваюцца арыгінальнымі задумамі. Гэтых работ сем. У адным эсэ нараджэнне танца

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

адбываецца ў таямнічым свеце, які не мае межаў. Работу адрознівае філасофскі падыход да тэмы. Ёсць эцюд, які запамінаецца вобразамі таты Танца і крохкага дзядзькі. Сілуэта, яны бласлаўляюць Паставу і Вобраз на шчаслівае сямейнае жыццё. Аўтар аднаго эсэ выступае ў ролі мастацтвазнаўцы, які піша аб вобразах гераінь, створаных Г.С.Уланавай. Эцюд пабудаваны ў форме інтэрв'ю са славутай балерынай.

Чатыры работы мы аднеслі да "5 тыпу". Яны маюць ярка акрэсленую тэндэнцыю да назвы "творчыя эцюды". Іх вызначае тонкае, эстэтычнае стаўленне да напісанага. Гэтыя эсэ зроблены вельмі эмацыянальна, на адным дыханні. У іх адчуваюцца ўнутраная экспрэсія і накал. Чытаючы работы, трапляеш у свет танца і робішся закаханым у балетнае мастацтва, якое здаецца нейкім незямным. Вось прыклад эсэ "5 тыпу", якое называецца "На фоне месяца".

"Я змагу. Здолею. Сёння пэўна змагу. Спынілася... Задумалася... Падняла голаў уверх, заплюшчыла вочы і ўздыхнула... А побач былі мора, ноч, месяц і зоры... Лёгкі, ледзь прыкметны рух наперад, нават не рух, а проста — намёк, нібы вецер у спіну штурхануў...

І рукі самі ўзнесліся — і ўзнік вобраз. І яна ўжо зусім не яна, а тая — іншая... Штуршок, скачок, палёт... І адбітак сілуэта на мокрым пяску. Так, добра... А цяпер — агромністы Месяц за спіной. (Вы толькі ўявіце: Яна на фоне Месяца!) У паставе толькі вось народжанай Венеры...

Так, гэта менавіта тое, што трэба. Менавіта тое. І марудна, марудна паварочваецца... Спіной... І раптам — азірнулася... Імкліва, нечакана. І — знерухомела... Ракурс — іншы... Уражанне — тое ж. Гэтак нараджаўся яе танец. Сёння гераіня дзеянняў — Яна. Паглядзім, ці зможа ён адмовіць Ёй сёння".

Падводзячы вынікі выкананага задання, мы папрасілі ўдзельнікаў падзяліцца адзін з адным сваімі пачуццямі (радаснымі або гнеўнымі), якія выклікалі ў іх прачытаныя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

работы. Неабходна было сказаць пра адчуванні, пра тое, як яны ацанілі эсэ, які ўплыў аказала на іх інфармацыя з эсэ. Кожны ўдзельнік эксперымента расказаў пра цяжкасці, якія перажыў, выконваючы прапанаванае заданне.

Такім чынам, рэфлексіўнае кола дапамагло нам зрабіць аналіз і падвесці першыя вынікі аналізу. Наяўнасць мастацкага вопыту стымулюе творчыя працэсы, актывізуе творчую прадуктыўнасць. Гэта, у сваю чаргу, уплывае на якасць выніку. Бацькі, якія маюць мастацкі вопыт і валодаюць тымі ці іншымі навыкамі і ўменнямі, імкнуцца пазнаёміць дзіця з яго ўласнымі магчымасцямі. Яны актыўна шукаюць, даследуюць навакольны свет, выкарыстоўваючы для гэтага фарбы, гукі, рухі, вобразы, якія маюць выключнае значэнне для творчасці.

У размове з бацькамі акрэсліліся некаторыя цікавыя асаблівасці мастацкага выхавання дзіцяці. Так, бацькі, якія прафесійна валодаюць уменнямі і навыкамі ў якім-небудзь відзе мастацтва і жадаюць навучыць гэтаму віду сваё дзіця, аддаюць перавагу навучанню яго ў іншага педагога, каб не пашкодзіць яму і не загнаць на вяршыню, з якой цяжка будзе спусціцца самому. Ведаючы знутры механізмы працякання творчых працэсаў, складзеныя з мудрагелістай фантазіі і ўяўлення, іскрыстай імгненнай інтуіцыі, бацькі цярпліва чакаюць таго моманту, калі дзіця адкрые ўнутры сябе тое каштоўнае, што зробіць яго непаўторнай індывідуальнасцю. І, што вельмі важна, бацькі вычарпальна адказваюць на ўсе дзіцячыя пытанні. Дапамагаючы дзіцяці адказваць на пытанні, бацькі такім чынам дапамагаюць яму адкрываць сябе, свае мажлівасці. А з дапамогай спецыяльных заняткаў па-мастацку адукаваныя дарослыя правакуюць і актывізуюць нараджэнне ў дзіцяці шчырых пачуццяў: натхнення, здзіўлення, радасці. Усе гэтыя ўмовы дазваляюць дзіцяці прыадчыніць новую грань уласнага “Я”. Бацькі фарміруюць у яго палітру пачуццёвага свету з самымі разнастайнымі адценнямі перажыванняў у працэсе ўзаемадзеяння з прыродай, людзьмі, з самім сабой і вынікамі мастацкай дзейнасці.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Адзначаецца і іншая тэндэнцыя, якая была выяўлена намі пры правядзенні першага і другога этапаў эксперымента. Іншы раз бацькі спыняюцца на дасягнутым узроўні, г.зн. больш не ўдасканальваюцца, не пашыраюць свой кругагляд, не папаўняюць веды, уменні і навыкі ці не рэалізуюць іх у практычнай дзейнасці, не праяўляюць актыўнасці ў адносінах з дзецьмі. Такім бацькам робіцца ўсё складаней адказваць на дзіцячыя пытанні маральнага і каштоўнаснага характару. Любое развіццё мае на ўвазе змены, вынік якіх пэўна бачны і даступны для назірання у адрозненне ад самога працэсу развіцця, які схаваны для навакольных людзей. Калі бацькі перастаюць клапаціцца пра культуру мыслення, эмоцый, самапазнання, эстэтычных пачуццяў, яны тым самым не вучаць сваё дзіця любові да цудоўнага, не закладваюць паняццяў цудоўнага і пачварнага, паняццяў добрага і дрэннага.

На другім этапе эксперыментальнай работы мы супаставілі і прааналізавалі поспехі і дасягненні дзяцей, ацэнку якім давалі самі бацькі, з баламі, атрыманымі па шкале тэста-апытальніка “адносіны да няўдач дзіцяці”. Мы прасачылі заканамернасць: чым вышэй колькасць дасягненняў дзіцяці (напрыклад, бацькі выявілі адзінаццаць важных момантаў за апошнія паўгода, якія пэўна кажуць пра поспехі), тым ніжэй бал па шкале тэста-апытальніка бацькоўскага стаўлення. Тлумачэнні: балы па шкале тэста ад 1 да 2 сведчаць пра тое, што дарослы лічыць няўдачы дзіцяці выпадковымі і верыць у яго. Сярод бацькоў, якія набралі па шкале “адносіны да няўдач дзіцяці” 2 балы, толькі адна маці мела цяжкасці і не напісала аб поспехах сваёй дачкі.

Сярод бацькоў — удзельнікаў эксперымента, якія маюць мастацкі вопыт, дасягненні і поспехі дзяцей былі апісаны падрабязна і старанна. Так, бацькі пішуць: “У нашага сына з’явілася цікавасць да касмічнай тэмы. Ён гадзінамі любіць разглядаць энцыклапедыю, раздзел пра Сусвет, прыдумвае цікавыя незвычайныя словы іншапла-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

нетнага паходжання. Вярнуўшыся з дзіцячага садка дадому, Дзіма ўвесь час звяртаецца да табліцы "сотні"; "Сын з цікавасцю паглядзеў у тэатры оперы і балета спектакль "Доктар Айбаліт". "Чытае" на памяць кнігу Шабельніка "Літарачка за літарачкай". Сам прыдумвае свае ўзоры з мазаікі і выкладвае іх, любіць гуляць з кубікамі Нікіціных. А нядаўна патэлефанаваў тату на працу, самастойна набраў нумар тэлефона" і г.д.

У бацькоў, якія атрымалі па шкале "адносіны да няўдач дзіцяці" высокі бал (7—8), колькасць дасягненняў і поспехаў дзіцяці, што апісвалі бацькі, значна ніжэйшая. Пяцёра бацькоў, якія маюць па шкале тэста балы ад 3 да 5, не напісалі ні аб адным поспеху дзіцяці, спасылаючыся на тое, што ім нічога не прыходзіць да галавы, што яны не ведаюць, аб чым пісаць.

Высокія балы па шкале "адносіны да няўдач дзіцяці" кажуць пра тое, што бацькі ігнаруюць зацікаўленні, думкі і пачуцці дзяцей, не прымаюць належнага ўдзелу ў выхаванні і развіцці дзіцяці. Зацікаўленні, захапленні, думкі і пачуцці дзіцяці здаюцца бацькам дзіцячымі і несур'ёзнымі. Дзіця ўяўляецца непрыстасаваным, непаспяховым, адкрытым для шкодных уплываў. У сувязі з гэтым некаторыя з бацькоў спрабуюць абараніць дзіця ад цяжкасцей жыцця і строга кантраляваць яго дзеянні. Апісанне дасягненняў і поспехаў дзіцяці ў гэтых бацькоў вельмі неапшматслоўнае і павярхоўнае. Ствараецца ўражанне, што бацькі ніколі сур'ёзна не задумваліся аб тым, што ўяўляе сабой іх дзіця, аб яго індывідуальна-псіхалагічных асаблівасцях.

Каб сфарміраваць здольнасць да актыўнага ўспрымання навакольнага свету, мастацкіх твораў, развіць цікавасць да мастацтва, эмацыянальна-пачуццёвую спагаду, пачуцці гармоніі і меры, творчае ўяўленне і вобразнае мысленне ў дзіцяці дашкольнага ўзросту, бацькам, акрамя зацікаўленасці, неабходны і мастацкі вопыт. Гэта дапамагае пры абранні форм сумеснага правядзення сямейнага адпачын-

ку, уплывае на змястоўны бок зносін, на сумесныя заняткі з дзецьмі. Уменні бацькоў забяспечыць адзінства рэкрэацыі і мастацка-творчага развіцця ўзбагачае мастацкія інтарэсы дзіцяці.

Бацькам, якія не маюць адукацыі, вопыту мастацкай дзейнасці, неабходна папаўняць свае веды самаадукацыйным шляхам для таго, каб дапамагчы дзіцяці засвойваць этыка-эстэтычныя каштоўнасці чалавечых учынкаў, твораў мастацтва, з'яў і прадметаў навакольнага свету. І, што вельмі важна, неабходна фарміраваць навыкі валявога самаімкнення, саманазірання, самакантролю і аналізу "Я", г.зн. рэфлексію. Эфектыўным спосабам мэтанакіраванага развіцця рэфлексіі ў бацькоў з'яўляецца пазнанне і разуменне дзіцяці праз уключэнне ў актыўную сумесную дзейнасць, калі дарослы ўмее адцягнуць увагу ад сваіх уласных перажыванняў і засяродзіцца на асобе дзіцяці, ягоных дзейнасці, вопыце, пачуццях і думках. Тады надыходзіць сенсітыўнае разуменне дзіцяці, якому трэба не проста фізічная прысутнасць бацькоў у хаце, а іх саўдзел у зносінах. Часцей атрымліваецца так, што ўсе спосабы зносін з дзіцем у сям'і зводзяцца да маналога. Дзіця лепей разумее іншых, калі бацькі разумеюць яго жаданні, патрэбы, просьбы, ягоную "шматабяцальную няпэўнасць".

Працэс выхавання творчасці ў дзяцей мае на ўвазе, перш за ўсё, выхаванне бацькоў, здольных кіраваць творча. Дарослы павінен дапамагчы дзіцяці авалодаць спосабамі актывізацыі цікавасці да навакольнага свету, які можа быць асэнсаваны з самых розных пазіцый.

Спашлемся на прыклад з нашага эксперымента. Алена Л., 6 з паловай гадоў, у дыягнастычнай методыцы "Дамалюй колцы" паказала найніжэйшы ўзровень развіцця здольнасцей да творчай дзейнасці, што ўказвае таксама і на нізкі ўзровень такога псіхалагічнага механізма, як уяўленне. Мы прапанавалі бацькам з дапамогай "гульні ў гульні" стварыць сітуацыю, якая б стымулявала і актывіза-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

вала фантазію дзіцяці. Мы прытрымліваліся палажэння, выказанага А.М.Лявонцьевым, пра тое, што ў псіхалагічных перадумовах дзіцячай гульні элементаў фантастыкі няма, а ёсць патрэба дзейнічаць, як дарослы. Мы ўзялі за ўзор тэзіс Л.С.Выгоцкага, які казаў, што гульня дзіцяці не ёсць просты ўспамін аб перажытым, але творчая перапрацоўка перажытых уражанняў, камбінаванне і пабудова з іх новай рэчаіснасці, якая адказвае запытам самога дзіцяці. Мы таксама ўлічвалі палажэнне А.Валона: усё, што трапляе ў поле зроку, выклікае ў дзяцей прыпадабненне. На значэнне фактару прыпадабнення ў гульні ўказваў В.Штэрн, які лічыў, што прыпадабненне рыхтуе важны працэс успрыняцця культуры. Дзіця, што да некага прыпадабняецца, падобнае на ўзор, на які яно хоча быць падобным.

Мы прапанавалі бацькам уявіць сабе, што яны з'яўляюцца рэжысёрамі, пастаноўшчыкамі і выканаўцамі дзіцячай казкі Генрыха Сапгіра "Людажэр і Прынцэса, або Усё наадварот". Ім неабходна было спачатку прачытаць казку свайму дзіцяці. Чытаючы казку, было важна праз інтанацыю, тэмбр голасу здолець пераканаўча выказаць пачуцці, выкарыстаць міміку, жэсты, рухі. Ад гнуткасці залежыць разуменне дзіцем сэнсу казкі і характэрных асаблівасцей герояў. Затым бацькі разам з дзіцем зрабілі размінку-імітацыю рухаў Людажэра і Прынцэсы. Гэта прынесла дзіцяці эмацыянальнае задавальненне, бо яно ўбачыла матулю і тату ў вобразах герояў. Затым бацькі папрасілі дзіця паказаць Прынцэсу. Яго пахвалілі за стараннасць. Як мы ўбачылі, шляхам імітацыі рухаў бацькі могуць навучыць дзіця заўважаць тонкасці характарыстыкі герояў, у даным выпадку героя казкі. Праз некаторы час маці зноў расказала казку і прапанавала ў адпаведнасці з методыкай "Дамалюй колцы" выканаць малюнак да казкі "Людажэр і Прынцэса". Усе выкананыя бацькамі гульнявыя практыкаванні садзейнічалі абуджэнню і развіццю новага, якасна больш высокага, узроўню ўяўлення ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дзіцяці. Яго другі малюнак атрымаў 7 балаў, што адпавядае сярэдняму ўзроўню.

Стымулюючы творча-ролевую гульню дзіцяці, бацькі садзейнічаюць развіццю вобразнага мыслення. Безумоўна, чым багацей мастацкі вопыт дарослага чалавека, тым больш ён садзейнічае пашырэнню вопыту дзіцяці. Рэгулярныя заняткі з дзіцем дазваляюць бацькам паэтапна ўплываць на фарміраванне ўяўлення. Педагагічныя сродкі, якія садзейнічаюць павышэнню ўзроўню ўяўлення дзяцей, самыя разнастайныя: ад чытання казкі і размовы з дзіцем, дзе прысутнічаюць спачатку схематычныя вобразы, да разнастайных гульняў і практыкаванняў, розных гульнявых заданняў, дзе належыць штосьці адгадаць, уявіць, дадаць і г.д. Усё гэта, у сваю чаргу, дазваляе будаваць стратэгію і тактыку мастацка-творчага развіцця дзіцяці. Сам працэс уключэння бацькоў у сатворчую дзейнасць спрыяе абуджэнню цікавасці да свайго дзіцяці, устанаўлення з ім кантактаў. Усе навучальныя заданні, якія мы прапанавалі бацькам, будаваліся па прынцыпе сумеснай дзейнасці.

Так, напрыклад, неабходна было падабраць да вобраза любімага героя казкі слоўны партрэт, а потым параўнаць яго з апісаннем аўтара. Пасля гэтага даць дадатковую, больш падрабязную, характарыстыку. Сам па сабе момант уключэння ў асацыятыўны маланкавы трэнінг (па тыпе брэмсторнінгу) ужо стымулюе ўяўленне дзіцяці. Адбываецца своеасаблівая ланцуговая рэакцыя, дзе дарослы-дзіця дзейнічаюць як адзіны мазгавы ланцужок. Прыкладам могуць быць слоўныя характарыстыкі для персанажаў байкі І.А.Крылова “Страказа і Мураш”. Характарыстыка Страказы: вясёлая, рухавая, лёгкая, надакучлівая, няўседлівая, легкадумная, негаспадарлівая, актрыса, гультаяватая, модніца, беспрытульная. Партрэт Мураша выглядае такім чынам: працаўнік, старанны, сур’ёзны, цвяроза мысліць, валявы, добрасумленны, прасталінейны, трохі сумны, нежанаты.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Затым мы прапанавалі прыдумаць для байкі іншых персанажаў і далі дзіцяці і дарасламу магчымасць выказацца. Нехта прапанаваў нетактоўную Муху-прыліпалу, працавітую пчолку, сур'ёзнага і ўпартага пугача, жыццярадаснага Караля-ільва, прыгожую і велічную птушку Фенікс і інш. Мы папрасілі прыдумаць сваю казку ці гісторыю з гэтымі персанажамі. Пасля чаго кожнае дзіця да свайго прыдуманага персанажа з дапамогай дарослага падабрала характэрны рух, што дапамагло стварыць пластычны вобраз.

Найпрасцейшым танцавальным рухам мы навучылі дзяцей, выкарыстоўваючы эцюды, практыкаванні, гульні, накіраваныя на развіццё навыкаў музычнага руху і эмацыянальна-асабістай сферы дзіцяці. Гэта своеасаблівая азбука выказвання эмоцый з дапамогай розных выразных рухаў, з якімі мы таксама пазнаёмілі бацькоў. Мы прапанавалі ім шэраг танцавальных гульняў, якія можна праводзіць у хатніх умовах. Штодзённа выконваючы дома практыкаванні, можна было авалодаць рухамі сістэмы выразных сродкаў, якія дазваляюць у далейшым зрабіць разнастайнымі танцавальныя рухі. Пантамімічныя рухі былі ў асноўным прадстаўлены апісальна-выяўленчымі жэстамі, рухамі рук і становішчам тулава. Трэба было, напрыклад, спачатку апісаць, а потым паказаць рухі слімака, ката, лебедзя, сонечнага промніка, сярэднявечнага рыцара, рухі драўлянага і шклянога чалавечкаў і г.д. Дзецям вельмі цікава абазначаць траекторыю палёту матыля, выкарыстоўваючы пры гэтым прыдуманы рух, складзены з узмахаў крылаў-рук. З дапамогай танцавальных гульняў можна лёгка задаволіць патрэбу дзіцяці ў руху і актыўнасці, тым самым прыцягнуць да далейшай творча-развівальнай дзейнасці.

На выніковых занятках перад намі выступалі дзеці, перадаючы сюжэт свайго апавядання ці казкі з дапамогай мовы мімікі, пластыкі, танцавальных рухаў і іншых невербальных характарыстык, выкладзеных у пэўны малюнак. У некаторых нумарах удзельнічалі і дарослыя.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

У працэсе далейшых зносін і размоў з бацькамі мы пазнаёмілі іх з методыкай француженкі Сесіль Лупан і яе кнігай "Павер у сваё дзіця". Як паказала наша эксперыментальная праца, у хатніх умовах бацькі могуць стварыць атмасферу "паглыблення" дзіцяці ў аўру мастацка-развіццёвых заняткаў з дапамогай спецыяльна падабраных практыкаванняў, нават не маючы мастацкага вопыту. Азбуку рухаў можна стварыць і самастойна, ведаючы асаблівасці цела свайго дзіцяці. Так, мы прапанавалі бацькам з трох апісанняў дзіцячага цела "Чарапашкі", "Коніка", "Лісічкі" выбраць адно, якое, на іх думку, найболей падыходзіць для канкрэтнага дзіцяці. (Гл.: Фридман И.К. О контакте родителей с детьми // Вопросы психологии. 1990.— № 1.— С.94—95). Да дадзенай характарыстыкі бацькам неабходна было прыдумаць сваю назву і прапанаваць формы заняткаў з дзіцем у вольны час. Большасць назваў, прыдуманых бацькамі, супалі з тымі, якія апісаны Фрыдман. Ёсць і іншыя, напрыклад: "Бураціна", "Юла", "Маленькі ўпарты", "Вожык", "Асілак", "Юны актор", "Нячысцік", "Какетка", "Гарэза" і інш. Канкрэтныя віды заняткаў з дзецьмі здолелі прапанаваць пяцёра бацькоў.

Усе ўдзельнікі навучальных заданняў адзначылі, што ў іх узнікла патрэба па-новаму зірнуць на сваё дзіця, бо яны зразумелі, наколькі важны працэс развіцця дзіцяці і якая адказнасць ускладаецца на дарослага. Некаторыя адзначылі, што ўпершыню сутыкнуліся з задачамі, якія неабходна вырашаць сваімі намаганнямі, аказваючы дапамогу дзіцяці. У бацькоў спрацоўвае стэрэатыпнае стаўленне да выхавання і развіцця дзіцяці, бо некаторыя з іх лічаць, што гэта — абавязак дзіцячага садка і выхавальнікаў.

Рэфлексія і ўсведамленне свайго выхаваўчага і мастацкага вопыту прыводзяць да распазнавання ўнутры сябе творчых крыніц, якія дапамагаюць у развіцці свайго дзіцяці. Выкарыстанне хатніх заданняў, якія пабудаваны



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

так, што неабходна рэгулярна рабіць самааналіз і самаацэнку, з'яўляецца дзейсным стымулам, які абуджае цікавасць і ўвагу ў бацькоў да свайго дзіцяці, магчымасці саўдзелу ў сумеснай дзейнасці.

Важнымі элементамі гатоўнасці да гэтай дзейнасці з'яўляюцца разуменне і актыўнасць бацькоў у працэсе зносін. Гэта прадвызначае самыя разнастайныя формы правядзення адпачынку, дзе патрэбны выдумка, уяўленне, наяўнасць мастацкага вопыту, а таксама ўменне адчуваць і разумець адно аднаго. Гэтае ўменне развіваецца і трэніруецца пры пастаянным кантакце дарослага і дзіцяці. Калі ў вачах дарослага свецяцца агеньчыкі, запаленыя дотыкам да цудоўнага, яго дзіця зможа палюбавацца застылай кропляй вады, якая пераліваецца ўсімі колерамі вясёлкі на сонцы, прыслухацца да шолаху лісця і пачуць музыку вясны. След ад сустрэчы з цудоўным застанецца на ўсё жыццё.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Шауро Г.Ф.**,
*профессор*
**Аль-Атум Монзер Самих**,
*аспирант*

## ИЗОБРАЗИТЕЛЬНОЕ ИСКУССТВО В ЭСТЕТИЧЕСКОМ ВОСПИТАНИИ МЛАДШИХ ШКОЛЬНИКОВ

Успешное решение задач, поставленных перед современной школой, невозможно без улучшения художественного образования и эстетического воспитания учащихся. Проблема эстетического воспитания серьёзно стоит во всём мире и обсуждалась неоднократно на конгрессах и симпозиумах.

Участников этих конгрессов волновала одна проблема: как спасти человечество от негативных сторон